## Антонімы

**163.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце пытанні. Дапоўніце кароткія адказы на іх патрэбнымі словамі.



Якога колеру шахматныя фігуры? Белыя і … .



Якога памеру бываюць сабакі? Вялікія і … .



Які настрой бывае ў дажджлівы дзень? Сумны і … .

Запішыце адказы на пытанні. Знайдзіце і падкрэсліце ў іх супрацьлеглыя па значэнні словы.

> Словы з супрацьлеглым значэннем называюцца **антонімамі.**

**164.** Падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы да прапанаваных. Запішыце антонімы парамі.

**Шчасце** — **бяда**, лета — …, блізка — …, многа — …, добры — …, доўгі — …, малы — …, мяккі — …, вайна — …, сцюжа — … .



Правообладатель Национальный институт образования

Дапоўніце прыказкі выдзеленымі словамі.

**шча́сце**

... усюды, дзе захочаш.
Калі хлеб у возе, то няма ... у дарозе.

**165.** Прачытайце загадку. З літар, што «схаваліся» на малюнках, складзіце адгадкі-антонімы.

Абедзве часта нас даймаюць,
шукаць ратунку прымушаюць.
Адна з іх **летам** узнікае,
што́раз купацца заклікае.
Калі яна мацнее ўдзень,
імкнёмся мы схавацца ў цень.

*жсцюа*

Другая — холадам **сцюдзёным**
**зімой** завітвае да нас,
пад стрэхі вераб'ёў загоніць,
дыханнем **ледзяным** абдасць.

*М. Пазнякоў.*

*аспёк*

Якія з выдзеленых слоў блізкія па значэнні, а якія — супрацьлеглыя?

Назавіце ў загадках словы з гукам [ц']. Як ён перадаецца на пісьме?

**Гаварыце правільна!**

**Два** хлопчыкі, **абодва** хлопчыкі, **дзве** дзяўчынкі, **абедзве** дзяўчынкі.



Правообладатель Национальный институт образования

**166.** Прачытайце прыказкі. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго.

**Увосень** плача, хто … скача.
На **чорным** полі … пшаніца родзіць.
**Летнюю** часіну … тыднем не заменіш.

Словы для даведкі: *белая, увесну, зімовым*.

**167.** Прачытайце. Вызначце прымету, па якой словы кожнай групы аб'яднаны ў пары. Падбярыце і дапішыце пару да кожнага выдзеленага слова.

1. Белы — чорны, зіма — лета, **цёмны** — …, **цёплы** — …, **раніца** — …, **сесці** — … .
2. Гоман — шум, загадкавы — таямнічы, **дзіва** — …, **баязлівы** — …, **доктар** — …, **сустрэцца** — … .

Словы для даведкі: *светлы, спаткацца, урач, халодны, вечар, нясмелы, устаць, цуд*.

**168.** Да выдзеленых слоў падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| **свежы** хлеб | пракіслае |
| **свежае** малако | чэрствы |
| **свежая** газета | цёплы |
| **свежы** вецер | старая |



Правообладатель Национальный институт образования

Запішыце спалучэнні слоў па ўзоры.

Узор: *свежы хлеб — чэрствы хлеб.*

З двума спалучэннямі слоў на выбар вусна складзіце сказы.

**Рм** Дзе можна купіць свежае малако і свежы хлеб? Дзе можна набыць свежую газету?

**Гаварыце правільна!**

[С’]вежы, [с’]ветлы, [с’]вітанне, [с’]цюжа, [с’]пёка, шча[с’]це, га[с’]цінец, [с’]мех, [с’]мелы, [с’]вет, рада[с’]ць.

**169.** Вусна падбярыце антонімы, якія характарызуюць:

1) *час*: змярканне — світанне, восень — …, рана — …;
2) *прастору*: далёкі — блізкі, высокі — …, шырокі — …;
3) *якасці*: брудны — чысты, дрэнны — …, шкодны — …;
4) *рысы характару*: маўклівы — гаварлівы, вясёлы — …, смелы — …;
5) *колер*: светлы — цёмны, белы — …;
6) *напрамкі свету*: поўдзень — поўнач, усход — … .

Запішыце тры групы антонімаў на выбар.



Правообладатель Национальный институт образования